**Выкарыстаная літаратура**

1. Рэлігія і царква на Беларусі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш – Мінск: БелЭн, 1999. – Т. 5. / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск: БелЭн, 2001. – 368 с.
2. Мысліцелі і асветнікі Беларусі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш – Мінск.: БелЭн, 1999. – Т. 5. / Б.І. Сачанка(гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелЭн, 1995. – 671 с.
3. Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч. 1. Са старажытных часоў да канца XVIII ст.: Курс лекцый. / І.П. Крэнь. І.І. Коўкель, С.В. Марозава і інш. – Мінск: РІВШ БДУ, 2000. – 656 с.
4. Подокшин С.А. Реформация и общественная мысль Белоруссии и Литвы (вторая половина XVI–начало XVII в.). – Мінск: Наука и техника, 1970.

## Уплыў краевай ідэалогіі на пошук форм нацыянальнага самавызначэння на беларуска-літоўскіх землях у пачатку XX ст.

Багалейша С. В. г. Мінск, БНТУ

На пачатку XX ст. назіраецца значнае ажыўленне беларускага і літоўскага нацыянальных рухаў. Народы, прыгнечаныя ў межах Расійскай імперыі, імкнуцца вызначыць свае адносіны да перспектыў развіцця ўласнай дзяржаўнасці і знайсці дзейсныя формы рэалізацыі гэтай ідэі. Важным этапам у развіцці беларускага нацыянальнага руху і змяненні яго ідэалогіі стала рэвалюцыя 1905–1907 гг. Пад яе ўплывам ён пачаў пераўтварацца ў істотны фактар грамадска-палітычнага і культурнага жыцця Беларуска-Літоўскага краю. Сфарміравалася ідэя палітычнай нацыі, якая была непарыўна звязана з краёвай ідэалогіяй. З'яўленне краёвасці ў грамадска-палітычным жыцці было выклікана абвастрэннем этнічных і сацыяльных адносін у Расійскай імперыі. Выпрацоўка асноўных палажэнняў краёвай ідэалогіі закончылася вясной 1906 г. Але, побач з афармленнем краёвай ідэалогіі, ўзмацнялася пачуццё прыналежнасці да пэўнага этнасу.

Ідэалогія краёвасці мела гістарычны падмурак і грунтавалася на гістарычнай памяці пра прыналежнасць беларускіх і літоўскіх зямель да Вялікага Княства Літоўскага. Краёўцы пастаянна апеліравалі да традыцый гэтай дзяржавы. Сцвярджаючы агульнасць гістарычнага лёсу ўсіх народаў былога ВКЛ, яны лічылі неабходным захаванне тэрытарыяльнай цэласнасці „гістарычнай Літвы”. У перыяд рэвалюцыі 1905–1907 гг. краёўцы выступалі за аўтаномію Беларуска-Літоўскага краю з сеймам у Вільні. Першым, хто сфармуляваў асноўную ідэю краёвай ідэалогіі быў Раман Скірмунт. “Усе жыхары беларуска-літоўскага краю незалежна ад этнічнай прыналежнасці і сацыяльнага паходжання павінны аб'яднацца ў сумеснай працы на карысць усяго краю і ўсіх яго народаў” – сцвярджаў ён [8, с. 24].

Краёвая ідэалогія нарадзілася ў асяроддзі ліцвінскай шляхты, прадстаўнікі якой зачастую адчувалі сваю прыналежнасць аднaчасова да розных этнасаў. Сярод яе прапагандыстаў у розныя гады былі Раман Скірмунт, Канстанцін Скірмунт, Міхал Ромер, Людвік Абрамовіч, браты Антон і Іван Луцкевічы і інш. Але кожны з іх па рознаму разумеў краёвасць. Гісторыкі звычайна выдзяляюць у краёвай ідэалогіі два накірункі: кансерватыўны і дэмакратычны (або ліберальна-дэмакратычны). Краёўцы дэмакратычнага накірунку падтрымлівалі сувязі з дзеячамі літоўскага і беларускага рухаў, абаранялі беларусаў і літоўцаў ад шавіністычных выпадаў. У краёвай ідэалогіі тэрмін "нацыя" выйшаў за межы этнічнага разумення і набыў палітычны змест. Галоўнай прыкметай нацыі стала агульнае грамадзянства. Да "нацыі ліцвінаў" адносілі палякаў, літоўцаў, беларусаў і інш., т.зв. "карэнныя" этнасы краю.

Адным з галоўных ідэолагаў дэмакратычна-ліберальнага варыянту краёвай ідэалогіі быў Міхал Ромэр (1880–1945 гг.). Менавіта ён быў ініцыятарам правядзення ў Вільні польска-беларуска-літоўска-яўрэйскіх з’ездаў прыхільнікаў аўтаноміі Літвы ў красавіку і маі 1905 г. Беларусы, якіх прадстаўлялі Іван Луцкевіч і Аляксандр Уласаў [9, с. 25], літоўскія палякі і яўрэі выступалі за аўтаномію „гістарычнай Літвы”, дзе будуць гарантаваны нацыянальна-культурныя правы кожнага этнасу. У іх разуменні “гістарычная Літва” уключала ўвесь Паўночна-Заходні край альбо Літву і Беларусь (Віцебскую, Гродзенскую, Магілеўскую губерні, Віленскі і Дзісенскі паветы) і павінна была стаць непадзельнай.

А вось літоўскія дзеячы адстойвалі ідэю аўтаноміі „этнаграфічнай Літвы з прылеглымі тэрыторыямі” і са сталіцай у Вільні. Палітычная аўтаномія, на іх думку, павінна была завяршыць фарміраванне сучаснага літоўскага народа. Таму згода паміж прадстаўнікамі розных этнасаў, якія пражывалі на беларуска-літоўскіх землях, так і не была дасягнута [5, с. 252–253]. Але беларусы не адмовіліся ад спробаў знайсці паразуменне з літоўцамі. У сувязі са слабасцю беларускага руху дабіцца аўтаноміі ўласнымі намаганнямі ўяўлялася ім надзвычай складаным.

Можна сцвярджаць, што ў перыяд з 1905 па 1917 гг. вядомыя дзеячы беларускага нацыянальнага руху браты Іван і Антон Луцкевічы, Вацлаў Ластоўскі і інш. падзялялі і прапагандавалі асноўныя пастулаты краёвай ідэалогіі, у першую чаргу праз свой удзел у масонскіх ложах.

Масонскія арганізацыі на Беларусі і Літве былі формай існавання нелегальных дэмакратычных таварыстваў краёвага накірунку. Да краёўцаў можна аднесці прадстаўнікоў грамадства Беларусі і Літвы, якія ў сваёй палітычна й і грамадзянскай дзейнасці выступалі з нацыянальна-культурных, рэлігійных і эканамічных інтарэсаў краю. Краёвая ідэалогія грунтавалася на ідэі адзінай палітычнай нацыі ў Беларусі і Літве [9, с. 19]. Прадстаўнікі масонскіх ложаў адмаўлялі этнакультурныя прынцыпы ў азначэнні нацыянальнага складу насельніцтва. Усе карэнныя жыхары Беларусі і Літвы, якія лічаць сваёй радзімай гістарычную Літву і ўсведамляюць сябе грамадзянамі Краю, належаць да адзінай нацыі “літвінаў”. Этнічнае паходжанне і культурная прыналежнасць адыгрывалі другарадную ролю. У сваёй практычнай дзейнасці краёўцы прызнавалі роўнасць палякаў, беларусаў, літоўцаў і яўрэяў як карэнных народаў Беларусі і Літвы, нягледзячы на рознасць моў. Усе “грамадзяне” беларускай і літоўскай зямлі павінны былі працаваць на карысць краю, пад якім звычайна разумелі землі былога ВКЛ.

У 1910 г. у Вільна ўзнікла ложа “Еднасць”(альбо “Лучнасць”). Сярод ініцыятараў яе ўтварэння былі браты Антон і Іван Луцкевічы. Узначаліў ложу дзеяч яўрэйскага руху, прыхільнік краёвай ідэалогіі Ежы Ром. Акрамя іх “братамі” ложы былі І. Красоўскі, Зыгмунд Нагродскі, Браніслаў Крыжаноўскі, Вітольд Абрамовіч,

Іван Прозараў, Энім Ром, Брамсан і Данатас Малінаўскас. У сакавіку 1911 г. у ложу быў прыняты Міхаіл Ромер. Афіцыйнае запрашэнне да ўступлення ён атрымаў ад Івана Луцкевіча.

Вось, што запісаў у сваім дзенніку М. Ромер: “Увечары прыйшоў Іван Луцкевіч і паведаміў, што ў нядзелю мясцовая масонская ложа прыняла мяне ў свой звяз. Калі гэта не фарс, а не якое-небудзь няспелае пачынанне жменькі летуценнікаў, а сапраўдная масонская арганізацыя, то я ўсім сэрцам далучуся да звязу”. Неўзабаве М. Ромер стаў адным з кіраўнікоў віленскага масонства.

У “Еднасціі” былі прадстаўлены ўсе асноўныя этнасы беларуска-літоўскага краю. “Браты” прытрымліваліся прынцыпаў краёвай ідэалогіі, успрымалі грамадства беларуска-літоўскага краю як адзінае і непадзельнае на асобныя этнасы, выступалі за дэмакратычны лад жыцця. Краёвая ідэалогія супрацьстаяла ідэалогіі этнічнага шавінізму. У палітычным плане выступалі за ўстанаўленне парламенцкай рэспублікі і аўтаноміі “гістарычнай Літвы”, як дзяржаўнага ўтварэння беларусаў і літоўцаў у межах дэмакратычнай, федэратыўнай Расіі.

У 1911 г. пачала дзейнічасць ложа “Літва”, якая ўваходзіла ў “Вялікі ўсход народаў Расіі” – арганізацыя аб’ядноўвала каля 40 ложаў. У склад ложы ўваходзілі Б Крыжаноўскі, З. Нагродскі, М. Сляжэвічус, І. Краскоўскі, Э. Ром, А. Луцкевіч, Ю. Шаўліс, а з 1912 г. – В. Ластоўскі і інш. “Літву” узначаліў Ромер. Даволі хутка Ромэр стаўся адным з кіраўнікоў масонаў на беларуска-літоўскіх землях. У сваім дзённіку ён пісаў: “Нашыя прынцыпы – братэрства, любоў і свабода чалавечага духу. Мы гуманісты ў самым высакародным і дзейным значэнні гэтага слова. Мы імкнёмся, каб гэтыя прыгожыя словы сталі рэальнасцю сумлення, дзеянняў і чалавечых адносін. Мы не выступалі супраць агульначалавечых каштоўнасцяў”.

Задачы і прынцыпы дзейнасці масонскіх ложаў, па меркаванню Рома, былі наступнымі: “Мы вельмі далекія ад перакананняў, што мэта апраўдвае сродкі, што з дапамогай хлусні, крывадушнасці і гвалту ці якога іншага амаральнага сродку можна стварэць якое-небудзь трывалае і надзейнае. Гэта памылковы погляд, што “вольныя муляры” маюць пэўныя антыграмадскія або антыкультурныя мэты, імкнуцца да панавання і знішчэння чалавечай культуры”.

Наша задача – не знішчаць, не ламаць, не разбураць, а ствараць і ўдасканальваць". "Вольныя муляры" абавязаны былі мець актыўную жыццёвую пазіцыю, каб пастаянна рэалізоўваць масонскія прынцыпы гуманізму. Закранаючы палітычны аспект масонскай дзейнасці, Ромер падкрэсліваў, што "брацтва" не з'яўляецца ні палітычным аб'яднаннем, ні партыяй. Але ва ўмовах расійскай дзяржавы арганізацыя будзе займаць антыўрадавую палітычную пазіцыю [8, с. 65]. Кожны член ложы ў любы момант мог пакінуць яе, але ён павінен быў прытрымлівацца адной абавязковай умовы: захоўваць таемнасць самаго факту існавання "вольных муляроў".

Пасля ўзнікнення "Еднасці" і "Літвы" многія пытанні дзейнасці краёўцаў абмяркоўваліся на сходах. Там вырашалася і праблема іх органу друку. Тагачасны орган "Przeglad Wilenski" (1911–1915 гг.), рэдактарам якога быў Людовік Абрамовіч, выклікаў незадавальненне. Газета лічылася шавіністычнай па сваёй сутнасці. Было прынята рашэнне арганізаваць новае краёвае выданне. 8 снежня 1912 г. выйшаў першы нумар. Яго падрыхтаваў Язэп Манькоўскі, які актыўна працаваў у асяроддзі віленскіх беларусаў, а праграмны артыкул напісаў Антон Луцкевіч. Газета была разлічана на пашырэнне краёвай ідэі сярод польскай грамадскасці краю. "Kurier Krajowy" літаральна патрабаваў ад польскай інтэлегенцыі дапамагаць культурнаму адраджэнню беларусаў і літоўцаў. Шмат увагі газета надавала беларускаму нацыянальнаму руху, адлюстроўвала яго характар і тэндэнцыі. Яшчэ адным сродкам прапаганды краёвасці стала выданне братамі Луцкевічамі штодзённай рускамоўнай "Вечерней газеты". Першы нумар выйшаў 18 верасня. 1912 г. Газета паспрыяла распаўсюджванню сярод рускай грамадскасці Вільні ідэй ліберальных дэмакратаў. У праграмных артыкулах першых нумароў "Вечерней газеты" і "Kuriera Krajowego" А. Луцкевіч сфармуляваў галоўныя задачы выданняў, якія цалкам адпавядалі дэмакратычнаму варыянту краёвасці і адвяргалі канцэпцыю этнічнага нацыяналізма. "У нас ніякім чынам нельга зыходзіць з інтарэсаў якой-небудзь адной нацыянальнай групы. Ва ўмовах разнастайнасці нацыянальнага складу насельніцтва трэба ўвесь час мець на ўвазе інтарэсы краю, як адзінага цэлага. Толькі ў гэтым выпадку магчыма нармальнае развіццё кожнай асобнай народнасці. Усведамленне, што ўсе мы,

жыхары гэтай зямлі, з'яўляемся грамадзянамі Краю – вось нашая зыходная кропка пры высвятленні патрабаванняў розных груп насельніцтва" – было напісана ў першым нумары "Вечерняй газеты". Шырока ўжываўся на старонках "Kuriera Krajowego" і "Вечерней газеты" тэрмін "грамадзянін Краю", адзін з асноўных з пункту погляду канцэпцыі палітычнай нацыі. Аўтары публікацый даводзілі, што жыццёва важныя для Краю пытанні павінны вырашацца з улікам інтарэсаў усіх этнасаў Беларусі і Літвы, асуджалі велікарускі і велікапольскі шавінізм, заяўлялі пра неабходнасць барацьбы з праявамі шавінізма сярод беларусаў і літоўцаў [11, с. 199–201]. Аднак у большай ступені у краёвасці прадстаўнікі беларускага нацыянальнага руху бачылі сродак, які дазволіць узмацніць пазіцыі беларускага этнасу ў нацыянальна-культурным і грамадска-палітычным жыцці Беларусі і Літвы.

Такім чынам, віленскія ложы сталі моцнымі цэнтрамі прапаганды ліберальна-дэмакратычнага накірунку краёвай ідэалогіі. Гэтаму спрыяла грамадска-палітычная і культурная дзейнасць віленскіх "братоў". Амаль усе яны былі аўтарытэтнымі дзеячамі розных этнічных рухаў і уплывалі на міжэтнічныя адносіны. Свае разважанні па розным праблемам грамадскасці яны публікавалі на старонках папулярных віленскіх выданняў "Lieturas Zinios", "Наша Ніва", "Вечерняя газета" і г. д.

У 1913 г. віленскае масонства ўступіла ў паласу крызісу, які досыць хутка быў пераадолены. У выніку ў кастрычніку 1914 г. ў Вільні была створана ложа "Беларусь". У яе склад увайшлі А. Луцкевіч, А. Булёта, П. Бугайлішкіс, М. Біржышка, І. Краскоўскі, А. Заўштоўт і К. Астахевіч. Сходы гэтай ложы праходзілі разам са сходамі "Літвы". Пэўнае арганізацыйнае афармленне ложы намячалася на восень 1915 г., аднак вайна ўнесла пэўныя карэктывы ў гэтыя планы. У гэты час адбывалася і абвастрэнне этнічных адносін у краі, што адчувалася ў дзейнасці этнічна змешаных масонскіх арганізацый. У гэты час ложы пачалі адасобліваццa па нацыянальнай прыкмеце. Тым не менш, Антон Луцкевіч у красавіку 1914 г. ахарактарызаваў пазіцыю кіраўнікоў беларускага руху як "дэмакратычна-краёвую". На думку беларускага палітыка, толькі такая пазіцыя дазволіць зменшыць "нацыянальныя сваркі, каторыя што болей развіваюцца ў нашай староне, марнуючы безкарысна падчас найлепшыя сілы народу". А. Луцкевіч запрашаў да сумеснай

культурна-нацыянальнай працы дзеля інтарэсаў усяго краю [6, с. 53].

Пачатак Першай сусветнай вайны, адступленне расійскіх войскаў з тэрыторыі „гістарычнай Літвы” прывялі да актывізацыі нацыянальных рухаў і яшчэ больш паспрыялі актывізацыі краёвай ідэі, што праявілася ў спробе стварыць на беларуска-літоўскіх землях Канфедэрацыю Вялікага Княства Літоўскага. Пастулат аўтаноміі Краю ператварыўся ў ідэю дзяржаўнай незалежнасці беларускіх і літоўскіх зямель.

Па ініцыятыве беларусаў была дасягнута дамова з польскімі, літоўскімі і яўрэйскім камітэтамі аб утварэнні Канфедэрацыі ВКЛ. Тая згода была аформлена “Універсалам Канфедэрацыі Вялікага Княства Літоўскага”, выдадзеным на чатырох мовах (беларускай, яўрэйскай, польскай і літоўскай) Часовай радай Канфедэрацыі 19 снежня 1915 г. [12, с. 42]. Там былі выкладзены асноўныя прынцыпы праекта. Ва Універсале адзначалася, што канфедэрацыя ствараецца на аснове незалежнасці Літвы і Беларусі як супольнай дзяржавы, дзе ўсім нацыям будуць забяспечаны роўныя правы. Канфедэраты заклікалі ўсе краіны, палітычныя і грамадскія арганізацыі і ўсіх грамадзян краю далучыцца да Канфедэрацыі ВКЛ. Першую невялічкую адозву напісаў І. Луцкевіч.

Як дапаўненне да Універсала той жа Радай у лютым 1916 г. была выдадзена адозва-заклік “Pileciai!” (“Грамадзяне!”), у якой больш падрабязна выкладаліся асноўныя пачаткі палітычнага ладу будучай канфедэрацыі” [1, с. 14]. Яна была напісана літоўцам Ю. Шаўлісам і выдадзена на польскай, беларускай, літоўскай, яўрэйскай мовах. Ён вёў і непасрэдныя перамовы з нямецкімі ўладамі, бо да вайны жыў у Германіі, добра ведаў нямецкую мову і меў там надзейныя сувязі.

У тэксце адозвы адзначалася, што “надзеі на Расію не толькі пустыя, але і шкодныя. Больш чым стогадовае супольнае жыццё з Расіяй найлепей гаварыла, што гэтая дзяржава хоча з намі зрабіць. Праз увесь час супольнага з намі жыцця яна панавала і сістэматычна імкнулася да таго, каб сцерці ўсе адзнакі нашай самабытнасці і адметнасці. Таму нашы надзеі на здзяйсненне жаданай волі нашага краю кіруюцца цяпер у другі бок: да збліжэння з сярэднееўрапейскімі дзяржавамі” [3, с. 8; 7, с. 13].

У адпаведнасці з гэтым дакументам канфедэраты планавалі зрабіць беларуска-літоўскія землі незалежнай дзяржаўнай адзінкай з сеймам у Вільні. У склад новай беларуска-літоўскай дзяржавы павінны былі ўвайсці землі, занятыя нямецкімі войскамі: Віленская і Ковенская губерні, беларуская і літоўская часткі Гродзенскай і Сувалкаўскай губерні, Курляндскай губерні і частка Мінскай, якія звязаны з Віленскім цэнтрам. Формы дзяржаўнага ладу павінны быць устаноўлены і зацверджаны Устаноўчым сеймам у Вільні, выбраным агульным, роўным, прамым і тайным галасаваннем" [1, с. 14]. Такім чынам, нягледзячы на распрацаваны праект Канфедэрацыі ВКЛ, "адраджэнне гістарычнай Літвы" не адбылося, што ў першую чаргу было выклікана супярэчнасцямі паміж беларусамі і літоўцамі, а таксама тым фактарамі, што ідэя канфедэрацыі не знайшла шырокай падтрымкі ні сярод беларускага, ні сярод літоўскага насельніцтва і не была падтрымана нямецкімі акупацыйнымі ўладамі.

У 1915–1916 гг. група беларускіх дзеячаў, якія засталіся ў Вільні, прыступілі да распрацоўкі асноў першай у гісторыі Беларусі нацыянальнай знешнепалітычнай канцэпцыі. У першую чаргу, яе асноўнымі аўтарамі і прапагандыстамі сталі браты Антон і Іван Луцкевічы. Будучыню Беларусі яны разглядалі ў цесным саюзе з дзяржавамі Балтыі і Украіны. Асноўныя палітычныя патрабаванні беларускага нацыянальнага руху былі складзены на аснове рэферата, распрацаванага БНК на чале з А. Луцкевічам, – "Злучаныя Штаты ад Прыбалтыкі да Чорнага мора", які быў прадстаўлены на ІІІ Кангрэса нацый 27–29 чэрвеня 1916 г. у Лазане (Швейцарыя) [4, с. 5]. Аднак выпрабавання часам гэтыя ідэі не вытрымалі. Абвастрэнне міжэтнічных адносін (асабліва польска-літоўскіх) пад уплывам нямецкай акупацыйнай адміністрацыі, хутка зруйнавалі гэты праект. Краёўцы наогул аказаліся адсунутымі на перыферыю грамадска-палітычнага жыцця.

Негледзячы на негатыўныя вопыт рэалізацыі канцэпцыі "адраджэнне гістарычнай Літвы" у перыяд Першай сусветнай вайны, беларусы засталіся прыхільнікамі краёвай канцэпцыі дзяржаўнасці. Яны яшчэ працяглы час выступалі за ўтварэнне беларуска-літоўскай федэрацыі або канфедэрацыі. Таму ідэя дзяржаўнасці гістарычнай Літвы ў 1917 г. яшчэ дамінавала ў беларускім нацыянальным руху на акупіраванай тэрыторыі.

Прадстаўнікі ж літоўскага нацыянальнага руху не прынялі гэтай ідэі. Яны цвёрда стаялі на пазіцыях утварэння ўласнай дзяржавы ў межах „этнаграфічнай Літвы з прылеглымі тэрыторыямі” і са сталіцай у Вільні. На гэтым шляху яны знаходзілі ўсё большую падтрымку з боку германскіх акупацыйных уладаў.

Літоўцы ў пачатку 1917 г. адмовіліся ад далейшых перагавораў, па рэкамендацыі Германіі канчаткова парвалі сувязі не толькі з беларусамі, але і з польскімі і яўрэйскімі нацыянальнымі цэнтрамі. Лідары літоўскага нацыянальнага руху выдалі 11 студзеня 1917 г. “Мемарандум аб аднаўленні незалежнай Літвы”. Вясной 1917 г. пачалася падрыхтоўка да стварэння пад пратэктаратам Германіі не Вялікага Княства Літоўскага, а літоўскай дзяржаўна-адміністрацыйнай адзінкі “малой Літвы”, без раўнапраўнага ўдзелу беларусаў. У сваю чаргу віленскія беларускія арганізацыі імкнуліся пераканаць літоўскі бок у неабходнасці далейшага супрацоўніцтва ў напрамку рэалізацыі праекта сумеснай беларуска-літоўскай дзяржавы і неабходнасці ўліку інтарэсаў усіх нацыянальнасцяў краю.

У пачатку верасня 1917 г. адбываецца канферэнцыя БНК, Беларускай сацыял-дэмакратычнай работніцкай групы і Віленскага камітэта БСГ. На канферэнцыі паўтараліся ўжо вядомыя агрументы на карысць літоўска-беларускай дзяржавы з дзвюма аўтаномнымі тэрыторыямі. Пры гэтым у яе склад прадугледжвалася ўключыць усе беларускія і літоўскія землі з абодвух бакоў фронту [2, с. 20]. І нават упершыню выказваецца патрабаванне аб скліканні Устаноўчага Сойму Літвы і Беларусі ў Вільні для выяўлення волі ўсіх жыхароў краю. Дзяржаўны лад будучай дэмакратычнай беларуска-літоўскай дзяржавы быў вызначаны наступным чынам: 1) перадача ўсёй уласнасці ў рукі народа; 2) унутранае размежаванне аўтаномных Беларускіх і Літоўскіх зямель поводле матчынай мовы жыхароў; 3) роўныя правы для ўсіх нацыянальнасцей краю; 4) прызнанне дзяржаўных правоў за ўсімі мясцовымі мовамі [2, с. 20–21].

Аднак у той час ў літоўскага боку ўжо былі зусім іншыя планы, у якія не ўваходзіла стварэнне беларуска-літоўскай дзяржавы. Пры дапамозе нямецкай улады ў Вільні 18–22 верасня 1917 г. адбылася Літоўская канферэнцыя “прадстаўнікоў нацыі” і была створана дзяржаўная рада – Тарыба – вярхоўны орган

Літвы [5, с. 10]. Па задумках літоўцаў Тарыба павінна была распаўсюджваць сваю дзейнасць і на беларускія землі. Тарыба абвясціла сябе "дзяржаўным цэнтрам Літвы", і беларусы нямецкай акупацыі ўваходзяць у яе склад "у якасці прадстаўнікоў падначаленай народнасці" [5, с. 255]. 13 лістапада 1917 г. прэзідэнт Нацыянальнага савета Літвы А. Смятона надрукаваў заяву аб размежаванні паміж Літвой і Беларуссю, у якой выказаў наступныя памкненні літоўцаў: "…Мы, літоўцы, адмаўляемся ад гістарычнай Літвы і патрабуем разам з гэтым толькі тэрыторыю, якую засяляе літоўскае племя. Гэта тэрыторыя абмяжоўваецца наступным чынам: пачынаючы ад Палангі, лінія праходзіць уздоўж прускай мяжы, затым праз Сувалкі і Гродна да Нёмана, адсюль праз Навагрудак да Бярэзіны… Такім чынам, абмежаваная тэрыторыя ахоплівае каля 80 000 квадратных кіламетраў і ў значнай большасці заселена нацыяй, якая гаворыць па-літоўску. Для будучай Літвы разглядаецца тэрыторыя, якая абмежавана з аднаго боку Нёманам, а з другога – прыблізна лініяй Аўгустаў – Беласток – Пружаны – Баранавічы – Навагрудак". 16 лютага 1918 г. была абвешчана Літоўская Рэспубліка. Такога павароту падзей ніхто не чакаў, і ён некалькі працвярозіў дзеячаў беларускіх арганізацый, што выразна выявілася ў скліканні 25–28 студзеня 1918 г. у Вільні супольнай канферэнцыі прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага руху на акупіраванай тэрыторыі. Падчас яе работы ў процівагу Літоўскай Тарыбе была створана Віленская беларуская рада (ВБР) на чале з А. Луцкевічам. ВБР аб'яўлялася каардынацыйным цэнтрам беларускіх арганізацый і прадстаўнічым органам у акупіраванай Германіяй Беларусі. Нацыянальны рух у Беларусі і Літве пачаў развівацца па розных накірунках. 23 сакавіка 1918 г. нямецкі кайзер прызнаў незалежнасць Літвы. Канцэпцыя беларуска-літоўскай федэрацыі страціла актуальнасць. Усе спробы віленскіх беларускіх арганізацый паўплываць на пазіцыю літоўскіх нацыянальных арганізацый, пераканаць іх у неабходнасці супрацоўніцтва і ўліку інтарэсаў усіх нацый краю былі беспаспяховымі.

Прыхільнасць беларусаў да канцэпцыі адраджэння дзяржаўнасці былога Вялікага Княства Літоўскага магчыма тлумачыцца ўсведамленнем недахопу ўласных сіл для працы над стварэннем беларускай дзяржавы. Літоўцы маглі стаць саюзнікам, які ўжо дасягнуў пэўных поспехаў, у тым ліку і на міжнароднай арэне.

Акрамя таго, Беларуска-Літоўская канфедэрацыя дазваляла пазбегнуць падзелу этнічнай беларускай тэрыторыі. Менавіта па гэтай прычыне і ў сувязі з слабасцю беларускага руху Віленскія беларускія дзеячы вельмі доўга захоўвалі вернасць краёвай ідэалогіі. Толькі на пачатку 1918 г. беларусы былі вымушаны канчаткова ад яе адмовіцца.

Такім чынам, на пачатку XX ст. у сілу неспрыяльных унутраных і знешніх абставін, краевая ідэалогія альбо ідэя палітычнай нацыі не стала падмуркам беларускага руху, хаця вельмі актыўна выкарыстоўвалася беларусамі. На Беларусі і Літве, як і амаль ва ўсёй Цэнтральна-Усходняй Еўропе перамагла ідэя культурнай (этнічнай) нацыі. Краёвая ідэя не вытрымала выпрабавання часам. Этнічныя каштоўнасці і ідэя ўласнай этнічнай дзяржавы аказаліся больш прывабнымі для нашых суседзяў, ў першую чаргу для літоўцаў і палякаў. Краёвасць як феномен грамадска-палітычнага жыцця знікла ў 1920–1921 г. Яна была перакрэслена ўмовамі Рыжскага міру 1921 г. і ўтварэннем "Сярэдняй Літвы" 1920 г.

**Выкарыстаная літаратура**


1. Багалейша С. Канфедэрацыя Вялікага Княства Літоўскага: праекты і здзяйсненні / С. Багалейша // Беларускі гістарычны часопіс. – 2005. – № 7. – С. 12–17.
2. Знешняя палітыка Беларусі: зборнік дакументаў і матэрыялаў / Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь [і інш.]; [Склад.: У.М. Міхнюк, Рэдкал.: І.І Антановіч (старшыня) і інш.] – Т. 1. (1917–1922 гг.). – Мінск: БелНДІДАС: Выдавецкі цэнтр БДУ, 1997. – 395 с.
3. Луцкевіч А. Палітычныя лозунгі беларускага руху / А. Луцкевіч // Зборнік “Наша Ніва”. – Вільня, 1920. – С. 8–18.
4. Луцкевіч А. Злучаныя Штаты ад Балтыйскага да Чорнага мораў / А. Луцкевіч // Свабода. – 1990. – № 2. – С. 5–8.
5. Мікніс Р. Літва і Беларусь: перэпетыі дзяржаўнасці ў пачатку 20 ст. / Р. Мікніс // Беларусіка – Albarutenika. – Мінск, 1997. – Кн. 6. – Ч. 1. – С. 249–257.
6. Навіна А. (А. Луцкевіч). Краёвае становішчэ // Спадчына, 1996. – № 1.
7. Сідарэвіч А. Беларускі шлях / А. Сідарэвіч // ЛіМ. – 1992. – 30 лістапада.

8. Смалянчук А. Дзеннік М. Ромера / А. Смалянчук // Спадчына. – 1998. – № 5. – С. 59–67.

9. Смалянчук А. “Краёвасць” у беларускай и літоўскай гісторыі 1905–1940 / А. Смалянчук // Беларускі гістарычны агляд. – 1997. – Т. 4. – Сш. 1–2. – С. 19–33.

10. Смалянчук А. Адраджэнне вольнага мулярства на беларускіх і літоўскіх землях на пачатку XX ст. // Вольныя муляры у беларускай гісторыі. Канец XVIII–пач. XX ст. / Беларускае гістарычнае таварыства. – Вільня: Gudas, 2005. – С. 157–185.

11. Смалянчук А. Беларускі рух пачатку XX ст. і ідэя палітычнай нацыі / А. Смалянчук // На шляху да праўды: Матэрыялы VIII Міжнар. навук. канф. "Шлях да ўзаемнасці" (Белавежа, 15–17 чэрв. 2000 г.) і "круглага стала" "Ідэя беларускасці і ідэя польскасці на мяжы тысячагоддзяў: да вызначэння паняццяў" (Мінск, 6–7 верас. 2000 г.) – Мінск.: Беларускі кнігазбор, 2001. – 224 с. – (Acta Albaruthenica; Кн. 2). – С. 196–205.

12. Турук Ф. Белорусское движение: очерк истории национального и революционного движения в Беларуси / Ф. Турук – М.: Гос. изд-во, 1921. – 144 с.

## К вопросу о развитии этнического самосознания белорусов

Богданович А. Б. г. Минск,
ГУО «Командно-инженерный институт» МЧС Республики Беларусь

Важнейшими аспектами, интересующими ученых, занимающихся исследованием исторических проблем этнического самосознания, являются общетеоретический (проблемы определения), генетический (возникновения и развития), территориальный (влияние на самосознание территории расселения), лингвистический (язык определенного этноса), социальный и политический (взаимосвязь и взаимовлияние общественно-политических и этнических процессов), культурологический (сфера культуры и ее взаимосвязь с этническими процессами).

В России работа по изучению этнического самосознания была развернута во второй половине XIX в. Проходивший в 1872 г. в Петербурге Международный статистический конгресс пришел к заключению, что национальная принадлежность не тождественна